# Сэлфі з універсітэтам

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў сустрэў Дзень ведаў шоу. Як растлумачыла яго рэжысёр, выкладчык спецдысцыплін БДУКіМ Агата Мацко, арганізатарам хацелася прадэманстраваць сучасны падыход да традыцыйнага свята. "Імпрэза "Я — студэнт БДУКіМ" задумвалася так, каб кожны першакурснік мог прасякнуцца гонарам, што стаў студэнтам нашай ВНУ", — дадала рэжысёр.**

Настасся ПАНКРАТАВА / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Сёлета па БДУКіМ конкурс пры паступленні, у сярэднім, складаў 3 чалавекі на месца. Прайшоўшы сур'ёзны адсеў, запаветныя студэнцкія білеты атрымалі 886 юнакоў і дзяўчат. З іх 504 будуць навучацца на дзённым аддзяленні. Гэтых шчаслівчыкаў і сустракаў ля ўваходу ў галоўны корпус універсітэта ді-джэйскі сэт.

Само свята пачалося з параду выкладчыкаў: яны пад апладысменты праходзілі па "чырвонай" дарожцы і рассаджваліся ў імправізаваным амфітэатры. З урачыстым словам да студэнтаў і выкладчыкаў звярнулася першы намеснік міністра культуры Ірына Дрыга. Яна, у прыватнасці, адзначыла: "Вам выпала вялікае шчасце вучыцца, працаваць у адной з самых лепшых ВНУ краіны. Хачу пажадаць студэнтам браць як можна больш ад выкладчыкаў — неардынарных, таленавітых, цікавых людзей, кожны з якіх з'яўляецца асобай ў нашай культуры. У які рэгіён нашай краіны вы не паехалі б, усюды сустрэнеце выпускнікоў гэтага ўніверсітэта. А ці ёсць большае шчасце ў чалавека, чым ведаць, што ты патрэбны, што цябе чакаюць, што твая праца, твае веды будуць запатрабаваныя?!"

Услед за першым намеснікам міністра выступіў рэктар навучальнай установы Юрый Бондар і выказаў упэўненасць, што сёлета да іх паступіла таленавітая моладзь, якая яшчэ не аднойчы дасць нагоду для гонару. "Сёння адмысловы дзень, прысвечаны не толькі тым, хто прыйшоў вучыцца, але і тым, хто прысвяціў сябе высакароднай справе асветы. Універсітэт ганарыцца сваімі педагогамі, якія шануюць традыцыі нацыянальнай культуры і ўдала спалучаюць іх з навацыямі", — падкрэсліў выступоўца.




Загадчык кафедры харэаграфіі БДУКіМ Святлана Пітюйская на "чырвонай дарожцы" для выкладчыкаў



Першакурснікаў і выкладчыкаў вітае першакурснік Аляксей Грос — лаўрэат Гран-пры на конкурсе ў Віцебску.

Віноўнікаў урачыстасцей чакаў тэатралізаваны нумар ад першакурснікаў у суправаджэнні кавер-гурта "Фарцісіма". З музычным падарункам выступіў пераможца конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні "Славянскі базар-2016" Аляксей Грос. Падтанцоўка актыўна карысталася смартфонамі і палкамі сэлфі, гледачы весела пазіравалі дрону, што ўзляцеў над іх галовамі. Нааспечаны студэнт-завочнік скарыстаўся становішчам саліста і зрабіў першае ўніверсітэцкае сэлфі з рэктарам. Пасля творчая моладзь прынесла клятву першакурсніка. Свята завяршылася гімнам ВНУ і феерверкам.

К

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ